Мая Радзіма - Беларусь

Сачыненне

# Яблынька

Сіткевіч Кірыл Андрэевіч
ДУА "Косаўская сярэдняя школа ім. А.Зайка", 6 клас

Ішоў урок беларускай літаратуры. Мы гаварылі пра беларускіх класікаў: Янку Купалу, Якуба Коласа, Уладзіміра Караткевіча, пра нашу радзіму – Беларусь. Настаўніца напісала на дошцы словы "Мая сям'я. Малая Радзіма. Беларусь".

–Дзеці, а для вас Радзіма – гэта што? З чаго яна пачынаецца?

Аднакласнікі адзін за адным цянулі рукі ўверх. Я маўчаў. Я дакладна ведаю, з чаго яна пачынае. Я нарадзіўся не ў г.Косава. Вёска, якая раней была маёй – Юкавічы. Тры гады таму назад наша сям'я пераехала ў самы маленькі горад Беларусі. Мне вельмі не хацелася ехаць на новае месца, бо ў Юкавічах я нарадзіўся, вырас, пайшоў у школу, навучыўся катацца на веласіпедзе... Дый мала яшчэ што здарылася тут. Але тата прыгнаў машыну, загрузілі туды рэчы, расселіся самі. І тут я успомніў пра маё дрэва, маю яблыньку, якую ўвосень мы з бацькамі купілі на кірмашы. Тады яны сказалі:

- Давай, сын, пасадзім дрэўца. Няхай яно будзе тваёй першай адказнай справай на ўсё жыццё. Палівай, даглядай – і яно аддзячыць цябе салодкімі яблыкамі.

Усю восень бегаў да дрэўца, ці не падсохла. Усю зіму перажываў, каб не падмерзла. Увесну з'явіліся лісточкі, кветачкі. Колькі радасці! "Мая яблынька вырасце і будзе радаваць сакавітымі яблыкамі ўсю нашу сям'ю,"- марыў я.

І тут пераезд. Бацька з матуляй заўважылі мае перамены ў настроі. Спыталі, што здарылася. Я толькі глядзей у той бок, дзе красавалася дрэўца. Бацька здагадаўся, моўчкі дастаў рыдлёўку, падкапаў яблыньку і паклаў у машыну.

Вечарам мы пасадзілі дрэўца на новае месца. Пакуль прынялося, доўга яшчэ хварэла. Але з дапамогай маіх бацькоў яблынька ачуняла і выпусціла першыя кволенькія лісточкі. Усе з палёгкай ўздыхнулі – прыжылася.

Горад Косава мне вельмі спадабаўся. Хутка знайшоў новых сяброў. Калі раніцай іду ў школу, заўсёды прывітаюся з дрэўцам, як з жывым чалавекам. Калі вучу ўрокі, яблынька лёгенька трапеча сваімі лісточкамі, падганяе мяне хутчэй выйсці на вуліцу.

Мінулай вясной мая яблынька ўпершыню зацвіла вельмі прыгожым цветам. А восенню мы сабралі першы, хоць і не вельмі вялікі, ураджай сакавітых яблыкаў. Нездарма мая бабуля гаворыць: "Найсмачнейшы хлеб - са сваёй працы"

Таму на ўроку я не вытрымаў і таксама падняў руку.

-Радзіма – гэта мама, тата, сястрычка і мая яблынька. Радзіма – гэта тое месца, у якім жывуць твае самыя родныя людзі. Радзіма – гэта яблыневы сад, дзе на радасць усім нам будуць цвісці яблыні!